Андруковіч Г.А., студ. гр. 302а ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Клімаў І.П.,
кандыдат філалагічных навук

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ФУНЭРАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСКАЙ ВІЛЬНІ
## (На прыкладзе віртуальнага Беларускага віленскага Музея імя Івана Луцкевіча)

**1. Гісторыя праблемы.** Фунэральная спадчына (ад лац. funeralis – пахавальны) – гэта спадчына, звязаная з пахаваннямі, пахавальным абрадам, помнікамі на некропалі, шанаваннем нябожчыкаў і шырэй – з памяццю пра пакаленні і людзей, якія пайшлі з гэтага свету. Фунэральная спадчына дазваляе даследаваць і асэнсаваць светапогляд і вераванні пэўных пакаленняў, даведацца пра іх стаўленне да смерці і верагоднасць існавання пасля смерці, вывучыць ідэнтычнасць гэтых людзей, іх генеалогію. Зрэшты, фунэральная спадчына захоўвае повязь пакаленняў і стварае сярод іх разуменне, што ўсе людзі на гэтай зямлі – часова.

Віртуальны Беларускі віленскі музей імя Івана Луцкевіча (далей па тэксце – БВМ імя І. Луцкевіча) ставіць перад сабой задачы інтэрпрэтацыі спадчыны “беларускай Вільні”. Беларускі погляд на спадчыну Вільні і Віленшчыны яшчэ недастаткова асэнсаваны, пры тым, што беларусы маюць доўгую і адметную гісторыю, звязаную з гэтым горадам. Гэта робіць звышактуальнымі задачы стварэння віртуальнага БВМ імя І. Луцкевіча, які дазволіць інтэрпрэтаваць самую розную спадчыну Вільні перш за ўсё ў аспекце яе сувязі з беларусамі і Беларуссю.

Актуальнасць дадзенай працы па выяўленні, даследаванні і інтэрпрэтацыі фунэральнай спадчыны Вільні (у т.л. і беларускай) пацвярджаецца, сярод іншага, узрастаннем колькасці навукова-папулярных праектаў у дадзеным кірунку. Сярод найбольш сур’ёзных варта адзначыць віртуальныя інтэрнэт-праекты Радзіма.орг http://radzima.org.ru (беларускамоўны інтэрнэт-партал пра беларускую спадчыну, у т.л. пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускую спадчыну Вільні) [1] і Форум в Вильнюсе http://vilnius.borda.ru (расійскамоўны інтэрнэт-партал пра віленскую спадчыну, з падраздзеламі пра фунэральную спадчыну і генеалогію) [2].

Вышэйзгаданыя парталы далёка не адзіныя – на сённяшні момант існуе, як мінімум, з дзясятак падобных жа рэсурсаў. Яны ў той ці іншай ступені асвятляюць віленскую фунэральную спадчыну з рознай ступеню напаўняльнасці і ў розных аспектах узнятай праблематыкі (яўрэйская, праваслаўная спадчына і да т.п.). Разам з тым, беларускі погляд на праблему недастаткова раскрыты, бо зведзены фактычна да канстатацыі існавання самой спадчыны з фотафіксацыяй ды пералікам знакамітых асобаў, пахаваных у Вільні. Усё гэта разам сведчыць пра актуальнасць тэмы для далейшай распрацоўкі і рэпрэзентацыі.

**2. Кірункі працы.** Кірункі працы па інтэрпрэтацыі і віртуалізацыі фунэральнай спадчыны беларускай Вільні прапануецца скіраваць у наступных аспектах:

- аспект генеалагічна-пошукавы;
- аспект мемарыяльнага турызму;
- аспект праблематыкі мультыкультурнага горада і палітыкі памяці датычна могілак;
- аспект мікрагістарычны і эстэтычны;
- тэхнічны аспект (праблема віртуалізацыі фунэральнай спадчыны).

Генеалагічна-пошукавы кірунак мусіць рэпрэзентаваць, па магчымасці, найбольш поўна спадчыну мінулых пакаленняў Вільні. Яго мэта – спрасціць такі пошук для віленчукоў, віленчукоў-беларусаў і іх нашчадкаў. Кірунак гэтак званага мемарыяльнага турызму (турызм з мэтаю наведвання магілаў продкаў) – вельмі перспектыўны і запатрабаваны ў свеце. У той жа час, беларусы-нашчадкі віленчукоў сёння не могуць атрымаць патрэбныя ім звесткі пра сваіх продкаў, што значна тармозіць развіццё гэтага кірунку беларускага турызму ў Вільні. Кірунак праблематыкі мультыкультурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

места і палітыкі памяці датычна могілак мусіць забяспечыць поле для дыскусіі на пастаўленыя, а таксама на падобныя тэмы.

Эстэтычны аспект разгляду віленскай фунэральнай спадчыны прадугледжвае тое ж, што прапануюць згаданыя вышэй інтэрнэт-рэсурсы, а менавіта: рэпрэзентацыя культурнага ландшафта могілак, хаатычных кампазіцый ансамбляў некропаляў у комплексе, а таксама асобных надмагілляў, эпіталіяў і мемарыяльных шыльдаў. Мікрагістарычны аспект разгляду віленскай фунэральнай спадчыны прадугледжвае паглыбленне эстэтычнага аспекту, што прадугледжвае разгляд культурнага ландшафту могілак як элемента штодзённага жыцця і г.д.

Тэхнічны аспект працы над віртуалізацыяй віленскай фунэральнай спадчыны прадугледжвае вырашэнне шэрагу задачаў па практычнай рэалізацыі заяўленых вышэй кірункаў і аспектаў. У межах тэхнічнай працы неабходна вырашыць наступныя падзадачы:

- форма віртуалізацыі матэрыялаў;
- форма арганізацыі працы па дапаўненні матэрыялаў on-line, а таксама па працы форума;
- праблематыка эфектыўнай працы інтэрнэт-рэсурса;
- тэхнічны бок супрацы з падобнымі да прапанаванага рэсурса;
- дызайн інтэрнэт-рэсурсу.

**3. Праект аддзела <u>Фунэральная спадчына</u> ў віртуальным БВМ імя Луцкевіча.** У мэтах вырашэння пастаўленых вышэй задачаў аб’екты інтэрпрэтацыі вырашана падзяліць на 2 асноўныя блокі:

- спадчына віленскіх могілак;
- мемарыяльныя шыльды і эпіталіі у гарадскім асяродку Вільні.

Падзел на згаданыя вышэй блокі дазволіць размежаваць аб’екты інтэрпрэтацыі па прынцыповай пазіцыі. У першым выпадку мы маем справу з комплекснымі аб’ектамі спадчыны – культурнымі ландшафтамі, кожны з якіх можна вычленіць з навакольнага ландшафту і рэпрэзентаваць як “рэч у сабе”. У другім выпадку мы маем справу з аб’ектамі, інтэграванымі ў іншы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ект спадчыны, рэпрэзентаваць які паасобна азначае – вырваць яго з кантэксту.

З улікам усяго прапануецца наступны канцэптуальны праект аддзела Фунэральная спадчына ў віртуальным БВМ імя Луцкевіча:

| аддзел | пададдзел | кірунак/аспект | змест |
|---|---|---|---|
| Фунэраль-ная спад-чына | даведкавы | генеалагічна-пошукавы | імёны, галерэя выяваў, пазнака ці захавалася пахаванне, мес-цазнаходжанне, вусная гісто-рыя, звязаная з пахаваннем, крыніцы |
| | культурна-эстэтычнага ландшафта віленскай фунэральнай спадчыны | мемарыяльнага турызму, эстэтычны | месцазнаходжанне, галерэя выяваў, відэа, абмеры, навуко-выя і публіцыстычныя тэксты, форум, спасылкі на Інтэрнэт рэсурсы з падобнай праблема-тыкай |
| | навуковы | мікрагістарычны, праблематыкі мультыкультурнага горада і палітыкі памяці датычна мо-гілак | тэксты, аналітычныя табліцы, спасылкі на рэсурсы, закана-даўчыя і інш. акты, публікацыі і інш. матэрыялы па прабле-матыцы даследавання, аховы, музеефікацыі, рэстаўрацыі і г.д. |

Дзеля паказу, як павінны працаваць пададдзелы і аддзел, варта прывесці прыклад. Ім служыць мемарыяльная шыльда з касцёла св. Барталамея Апостала ў Зарэччы. Шыльда змяшчалася на муры касцёла св. Барталамея Апостала, пасля была вынятая з мура і ператвораная ў музейны экспанат Нацыянальнага гістарычнага музея Літоўскай Рэспублікі, дзе экспануецца. Пры рэпрэзентацыі спадчыны дадзенага аб’екту плануецца:

- перапісаць тэкст эпіталіі з шыльды;

- пры магчымасці скапіяваць знешні выгляд самой шыльды;

- унесці звесткі наконт шыльды ў даведкавы пададдзел (імёны з эпіталіі, выява шыльды, пазнака, што шыльда захавалася ў якасці музейнага экспаната, пазнака, што адпаведнае пахаванне ў касцёле захавалася/не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захавалася (па правядзенні спецыяльнага даследавання ў касцёле), месцазнаходжанне касцёла г. Вільня, раён Зарэчча (Użupis), месцазнаходжанне шыльды – фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Літоўскай Рэспублікі (інвентарны № экспаната: IM4637);

- унесці звесткі наконт шыльды ў пададдзел культурна-эстэтычнага ландшафта віленскай фунэральнай спадчыны (месцазнаходжанне касцёла і экспаната, выява шыльды, а таксама 3D-рэканструкцыя шыльды на муры касцёла, відэа з апытаннем святара касцёла і прыхаджанаў, навуковыя і публіцыстычныя тэксты, прысвечаныя тэматыцы рэстытуцыі і раз'яднаных каштоўнасцяў, форум па праблеме, ці варта вяртаць шыльду на касцёл, ці яна ўжо з'яўляецца самастойнай адзінкай спадчыны, спасылкі на I-нэт рэсурсы па праблематыцы рэстытуцыі і раз'яднаных каштоўнасцяў);

- унесці звесткі наконт шыльды ў навуковы пададдзел (тэксты і аналітычныя табліцы па спадчыне касцёлам св. Барталамея Апостала ў Зарэччы, спасылкі на рэсурсы з касцёлам св. Барталамея Апостала ў Зарэччы, заканадаўчыя акты Літоўскай Рэспублікі па рэстытуцыі і рэстаўрацыі, публікацыі па праблематыцы даследавання, аховы, музеефікацыі, рэстаўрацыі гістарычнага раёну Зарэчча і касцёла св. Барталамея Апостала).

**4. Заключэнне.** З разгледжанага вышэй матэрыялу і прыкладаў можна зрабіць выснову, што інтэрпрэтацыя фунэральнай спадчыны беларускай Вільні ў складзе віртуальнага БВМ імя Івана Луцкевіча можа стацца дзейсным грунтам для рэпрэзентацыі беларускага погляду на шматкультурную спадчыну Вільні.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Караваева, Н. В. Социально-экологические аспекты изучения некрополей как феномена культурного наследия на примере Москвы (диссертация на соискание степени кандидата географических наук). - М. 2007.
2. http://radzima.org.by Скачана 15.12.2010 г. ў 20.15;
3. http://vilnius.borda.ru Скачана 1.12.2010 г. ў 20.46;


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Андруковіч Г.А., Шулаева А.Л. Матэрыялы навукова-даследчай экспедыцыі ў Вільню (на правах рукапісу)

**Дадатак. Тэкст шыльды з касцёла св. Барталамея Апостала.**

*"D.O.M.*

*Ten Klasztor W:W:PP:BERNARDYNEK Zarzecznych Ktory*

*W Ru 1793 BĘDĄC Zupelnie Doszczętu Spustoszony i Przez*

*Gwałtowny Ogien w Czasie Rewolucyinym Spalony*

*Zdarzyla więc Opatrzność Naywysza Ze Te same Osoby*

*Zakonne w Ru 1807 NANOWO Własnym Swoim Kosztem*

*Wyfundowali Niemniey i Zadolozeniem Starania Tych*

*Następuiących Osob to iest :I:W:Ignac:PARCZEWSKIEGO*

*POLKOW:WOYSK:ROSS.WIEL:I:Pana Wincen:SZCZEFFANOWICZA*

*Komdr. Xo ZMUDZgo Takoz XoDza OPTATA GODEBSKIEGO Prowinc:*

*Xo DALECKIEGO KUST: WILEN:X BUBIEWICZA PROKURA: KLASZ: WILEN: i*

*Wielu innych II:WW:Dobrodziejow, A Kto Tylko Będzie Łaskaw*

*Przeczytac Te Słowa Ktore tu Są Wyryte Niech Tedy Raczy*

*Zmowic choc Iedne ZDROWAŚ MARYA za Zywych I Umarlych*

*Tych Dobrodziejow FUNDATOROW"*

(Plaque from Vilnius (Użupis) Convent of the Immaculate Conception of the Blessed Virgin Mary of the Bernardine sisters - подпіс пры экспанаце ў музеі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ